Параўнанне сістэм кіравання канферэнцыямі

Дубіцкі А.В., Балашкова Г.І., Касцюк Д.А.

Linux Vacation / Eastern Europe, info@lvee.org

A review of Conference Management Systems is presented, with focus on free/libre and open source software. Time-arranged list of CoMS with notes on their usage and underlying platform is followed with the generalized functionality overview. Brief description of two proprietary CoMS is done for the comparison purposes.

Прычына з'яўлення вэб-інструментаў для арганізацыі канферэнцый – высокая працаёмкасць ручной апрацоўкі тэзісаў дакладаў (асабліва для акадэмічных канферэнцый). Па меры нарошчвання дадатковага функцыяналу, такія сістэмы ператвараліся ў праблемна-арыентаваныя сістэмы кіравання кантэнтам (conference management system, CoMS), ахоплівалі розныя віды дзейнасці, звязаныя з працэсам падрыхтоўкі канферэнцыі. Многія CoMS першапачаткова былі створаны для канкрэтнай канферэнцыі, а потым сталі асобным прадуктам. Не абыйшла бокам гэтая тэндэнцыя і FOSS-канферэнцыі; вядомы аўтарам на цяперашні момант спіс свабодных CoMS [1, 2] можна ўбачыць у табліцы.

У працэс падрыхтоўкі канферэнцыі звычайна ўваходзяць этапы падачы тэзісаў або артыкулаў, рэцэнзаванне, прыняцце рашэнняў праграмным камітэтам, фарміраванне праграмы і публікацыя зборніка. Падача тэзісаў ажыццяўляецца адсылкай па e-mail або загрузкай файла (зрэдку – рэдагаваннем тэксту ў экраннай форме). Анлайн-рэцэнзаванне тэзісаў для вялікіх канферэнцый можа ўключаць сляпое рэцэнзаванне і аўтападбор рэцэнзентаў па адзначанай прадметнай вобласці. Падача, разгляд тэзісаў, прыняцце рашэнняў суправаджаюцца зваротнай сувяззю па e-mail. Некаторыя CoMS прадастаўляюць дадатковыя магчымасці – вядзенне сайта, анлайн-публікацыю матэрыялаў, рэзерваванне нумароў у гатэлях і інш.

CoMS (ліцэнзія, год)	Дзе выкарыстоўваецца	Платформа
Open Conference Systems (GPL, 2000)	Шэраг акадэмічных канферэнцый	PHP
Act toolkit (Artistic license, 2004)	YAPC::Eu	Perl
Pentabarf (GPL, 2005)	Закінутая з 2009 г. DebConf, FOSDEM	Ruby on Rails
YaCOMAS (GPL, 2005)	Закінутая з 2013 г.	Java, JSP
Frab (MIT, 2011)	FrOSCon	Ruby on Rails

ConMan (2008)	Utah Open Source Conference, Texas Linux Fest	Python/Django
Zookeepr (GPL, каля 2008)	linux.conf.au	Python/Django
OpenConferenceWare (MIT, 2009)	Open Source Bridge	Ruby on Rails
LVEE engine (GPL, 2009)	LVEE, FOSS Lviv	Ruby on Rails
Scalereg (GPL, 2009)	Southern California Linux Expo	Python/Django
Summit (AGPL, 2010)	Ubuntu Developer Summit	Python/Django

Добры прыклад развітога функцыяналу – найстарэйшая з вядомых аўтарам вольных сістэм, Open Conference Systems (OCS). Яе функцыянал ўключае такія характэрныя для CoMS асаблівасці, як арыентацыю больш чым на адну канферэнцыю (ёсць сродкі стварэння, рэдагавання, выдалення канферэнцый) і размежаванне правоў доступу па ролях [3].

Профіль арганізатара ў OCS можа мець ролю адміністратара сайта альбо мэнэджэра канферэнцыі. Мэнэджар канферэнцыі мае доступ да кіравання кантэнтам і створанымі канферэнцыямі, рассылання e-mail, рэцэнзавання тэзісаў, файлавага мэнэджэра. Заўважым, што цесная сувязь роляў мэнэджэра канферэнцыі і рэцэнзента характэрна менавіта для вольных CoMS (напрыклад, у LVEE engine рэцэнзент – «суб-роля», вытворная ад ролі рэдактара кантэнту), і гэта тлумачыцца іх валанцёрскай прыродай.

Як і іншыя CoMS для міжнароднай аўдыторыі, OCS ўключае сродкі інтэрнацыяналізацыі. Такая ж характэрная асаблівасць – вядзенне гісторыі дзеянняў, статыстыкі, магчымасць імпарту і экспарту дадзеных. Акрамя рэгістрацыі і працы з тэзісамі, у OCS ёсць планіроўшчык, інтэграваныя сродкі аплаты, арганізацыя пражывання ўдзельнікаў.

Як правіла, CoMS строга прытрымліваюцца стандартнага працоўнага працэсу па арганізацыі канферэнцыі (у выпадку OCS можна асабліва вылучыць таймлайн канферэнцыі, а таксама дзяленне на секцыі і складанне праграмы), прычым частка функцыяналу ўпарадкавана ў рамках гэтай паслядоўнасці дзеянняў. Таму дакументацыя шэрагу CoMS змяшчае дыяграмы, якія наглядна ілюструюць гэты працэс для розных роляў карыстальнікаў сістэмы [2, 3]. Этапы рабочага працэсу OCS ўключаюць размяшчэнне матэрыялаў на сайце, анонсаў, прапаноў спонсарам, адпраўку ўдзельнікамі тэзісаў і прапаноў у будучую праграму канферэнцыі (i), рэцэнзаванне тэзісаў і пацвярджэнне іх прыняцця ў праграму (ii), фарміраванне секцый канферэнцыі (iii). Прывязка этапаў работы да часу можа быць больш жорсткай (Pentabarf) або хутчэй разумецца (LVEE engine).

Для параўнання функцыяналу і магчымасцяў з прапрыетарнымі сістэмамі разгледзім у якасці альтэрнатывы дзве несвабодныя CoMS з бясплатным выкарыстаннем, як характэрныя прыклады гэтых праграм.

Першы прыклад прапрыетарнай CoMS – праект ConfTool, у якога ёсць бясплатны варыянт для некамерцыйных канферэнцый (не больш чым 150 удзельнікаў). ConfTool напісаны на PHP, што робіць яго код зручным для дапрацовак. Для бясплатнай версіі прадукта была распрацавана ліцэнзія, якая ўключае некаторыя абмежавальныя элементы капілэфту, каб стымуляваць вяртанне карыстальніцкіх дапрацовак у асноўную версію. Сярод функцый сістэмы – шматмоўнасць, асабісты профіль ўдзельніка, праца з тэзісамі, рэцэнзаванне, розныя варыянты аплаты, выпіска рахунку. Бясплатная версія прадастаўляецца без тэхнічнай падтрымкі і патрабуе пэўных тэхнічных ведаў для ўстаноўкі і настройкі, але на сайце прысутнічае падрабязная дакументацыя і нават дэма-версія. Шэраг магчымасцяў наўмысна выключаны з бясплатнай версіі; напрыклад, у ёй адсутнічае магчымасць паўнавартаснага акадэмічнага рэцэнзавання тэзісаў, фарміравання праграмы канферэнцыі, а спіс роляў у чатыры разы карацей (толькі аўтар, удзельнік, член праграмнага камітэта, валанцёр і адміністратар сайта).

Другі прыклад – Conference management toolkit (CMT), бясплатная CoMS Microsoft Research, якая патрабуе для працы ASP.Net, IIS і MS SQL Server (што вядома ставіць пад пытанне бясплатнасць). У адрозненне ад папярэдняга прыкладу, акрамя базавых роляў карыстальнікаў, CMT ўключае некаторыя дадатковыя – укладальнік праграмы, рэцэнзент, мета-рэцэнзент, рэдактар зборніка. Таксама падтрымліваюцца паралельныя секцыі (у папярэднім прыкладзе гэты функцыянал быў рэалізаваны ў дадатковым платным модулі, які не ўваходзіў нават у камерцыйную версію). Ёсць гібкі механізм падачы тэзісаў, рэцэнзаванне (з прызначэньнем у ручным і ў аўтаматычным рэжыме), сродкі сувязі з аўтарамі, падачы чыставых артыкулаў, падрыхтоўкі зборніка, падрабязная дакументацыя. Сістэма прадугледжвае іерархію тэм, працу з кантэнтам, форум, абвесткі і e-mail, падтрымку працоўнага працэсу аргкамітэта (напрыклад, анлайн-нарады). Асаблівасцю з'яўляюцца пашыраныя сродкі кіравання канфліктамі, інтэграваныя сістэмы антыплагіяту і кантролю аўтарскіх правоў, а таксама аўтаматызаваная падрыхтоўка лістоў для візавай падтрымкі ўдзельнікаў.

Літаратура

1. Marier F. List of Open Source Conference Management Systems // https://feeding.cloud.geek.nz/posts/list-of-open-source-conference/
2. Бароўскі А.Ю., Касцюк Д.А., Чабатароў П.В., Шадура А.А. Выкарыстанне lvee engine ў працэсе падрыхтоўкі канферэнцый // Третя міжнародна науково-практична конференція FOSS Lviv 2014: Збірник наукових праць / Львів, 2427 квітня 2014 р. – С. 106 – 111.
3. OCS in a hour. An Introduction to Open Conference Systems. September 2, 2008. https://pkp.sfu.ca/files/OCSinanHour.pdf